# у кнігу гісторыі БЕЛАРУСІ



Загадчык кафедры савецкай літаратуры Сафійскага універсітэта прафесар С. Русакіеў некалькі дзён быў госцем філалагічнага факультэта.

На здымку: прафесар С. Русакіеў сярод студэнтаў і выкладчыкаў філфака.

Фота І. АСКІРКІ.

# НАВУКІ

хаду Савецкага Саюза і замежных краін, накіраваныя на больш поўнае, рацыянальнае выкарыстанне азёрных рэсурсаў, устанаўленне заканамернасцей і накіраванасці развіцця азёрных басейнаў і асобных азёр.

Вывучэнне заканамернасцей размеркавання мікраэлементаў у глебах БССР і ўстанаўленне эфектыўнасці мікраўгнаенняў з'яўляецца састаўной часткай такой актуальнай праблемы, як распрацоўка навуковых асноў каранных меліярацый малапладавітых глебаў. Сюды ж непасрэдна прымыкае і складанне табліцы банітэта глебаў для дакладнай ацэнкі іх якасці, неабходнай пры планаванні сельскагаспадарчых работ у рэспубліцы, і высненне ўплыву кліматычных умоў БССР на ураджайнасць і размяшчэнне сельскагаспадарчых культур, і шэраг іншых даволі важных пытанняў.

Важнейшай тэмай з'яўляецца стварэнне на базе ЭЦВМ «Мінск-2» мнагапультавай вылічальнай сістэмы, якая распрацоўваецца кафедрай электронных матэматычных машын у садружнасці з вылічальным цэнтрам універсітэта. Прадугледжваецца, што машына разам з асноўнай работай будзе абслугоўваць да ста пультаў, вынесеных у вучэбныя і іншыя лабараторныя памяшканні, і выконваць дзве функцыі. Па-першае, яна павінна з'яўляцца настольнай вылічальнай машынай з даволі пашыранымі магчымасці, і, па-другое, з дапамогай пультаў плануецца здзейсніць працэс праграміраванага навучання. Апошні будзе весціся на значна больш высокім узроўні, чым гэта робіцца цяпер з дапамогай сучасных навучаючых машын. Дастаткова сказаць, што працэс навучання з дапамогай гэтай сістэмы можа праводзіцца на разгалінаванай праграме, і для кожнага студэнта машына зможа выпрацоўваць свой індывідуальны рэжым навучання.

Распрацоўкай сур'ёзных навуковых праблем заняты творчы калектыў матэматычнага факультэта. Дастаткова пералічыць толькі тыя напрамкі, у якіх паспяхова працуюць нашы матэматыкі. Гэта тэорыя звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў, вылічальная матэматыка і тэорыя метадаў прыбліжаных вылічэнняў, краявыя задачы і асаблівыя інтэгральныя ўраўненні, тэорыя ўраўненняў матэматычнай фізікі і тэорыя тапалагічных груп. Кіруюць імі вядомыя вучоныя, такія, як акадэмікі АН БССР прафесары Н. П. Яругін, В. І. Крылоў, Ф. Д. Гахаў, С. М. Беланосаў, а таксама нядаўна паспяхова абараніўшы доктарскую дысертацыю, малады выпускнік універсітэта У. П. Платонаў. Няма сумнення, што вынікі, атрыманыя гэтым калектывам, зоймуць дастойнае месца ў радзе буйнейшых навуковых дасягненняў савецкіх матэматыкаў.

Вялікая ўвага ва універсітэце ўдзяляецца даследаванням у галіне хіміі. Тут неабходна адзначыць плённую дзейнасць кафедр арганічнай, неарганічнай, фізічнай і аналітычнай хіміі, нафтахіміі, хіміі высокамалекулярных злучэнняў. Супрацоўнікамі першай з іх сінтэзіравана звыш 50 новых перакісных злучэнняў, якія з'яўляюцца энергічнымі ініцыятарамі палімерызацыі. Сумесна з аптычнымі кафедрамі вывучаецца іх структура і фізіка-хімічныя (у прыватнасці, спектраскапічныя) уласцівасці. Такая садружнасць дае магчымасць выкарыстаць вялікі комплекс сучасных эксперыментальных метадаў і дасягнуць максімальнай эфектыўнасці ў вырашэнні важнай праблемы атрымання новых палімерных матэрыялаў. Прадугледжваецца таксама распрацоўка новых спосабаў атрымання феррытаў, якія прымяняюцца, напрыклад, у запамінальных уладкаваннях электронных вылічальных машын, распрацоўка і ўкараненне прамысловых метадаў іоннага абмену з мэтай ачысткі вод і здабывання з іх каштоўных рэчываў, а таксама атрымання высокачыстых антыбіётыкаў, медпрэпаратаў, паўправадніковых матэрыялаў і г. д.

У сувязі з адкрыццём у Беларусі нафтаносных месцанараджэнняў і арганізацыяй іх прамысловых распрацовак на парадак дня пастаўлена пытанне эфектыўнага і паўнацэннага выкарыстання нафтавых свідравін. Гэта праблема будзе вырашацца комплексна многімі зацікаўленымі вучонымі і вытворчымі арганізацыямі. Пасільны ўдзел прымуць і супрацоўнікі кафедры нафтахіміі. На кафедры плануецца арганізаваць даследаванні ў двух напрамках, цесна звязаных з запатрабаваннямі нашай народнай гаспадаркі. Гэта, па-першае, выкарыстанне газаў, утвораных у выніку тэрмахімічнай перапрацоўкі нафты, з мэтай атрымання высокаякаснага прадукта для вытворчасці каўчукаў. Па-другое, атрыманне дадзеных па тэрмахімічных уласцівасцях вуглевадародаў, неабходных для разлікаў абсталявання і праектавання прадпрыемстваў нафтахімічнага сінтэзу. Указаныя работы ўжо знайшлі сваё частковае ажыццяўленне ў першых выніках, атрыманых маладым калектывам.

Вялікія і ганаровыя задачы стаяць перад вучонымі ў галіне грамадскіх навук. Комплекснае вырашэнне важнейшых праблем эканамічнага, палітычнага і духоўнага развіцця нашага грамадства, змяненні сацыяльнай структуры, удасканаленне дзяржаўнага ладу і развіццё сацыялістычнай дэмакратыі, абагульненне вопыту нашай партыі ў правядзенні сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, у вырашэнні нацыянальнага пытанняў, умацавання дружбы народаў СССР павінны быць праведзены на высокім узроўні. Абагульняючы паўвяковы шлях барацьбы і перамог савецкага народа, кіруемага Камуністычнай партыяй, вучоныя-грамадствазнаўцы павінны ўдзяліць самую сур'ёзную ўвагу праблеме фарміравання новага савецкага чалавека. Неабходна адзначыць, што ўсе гэтыя пытанні знаходзяць сваё адлюстраванне ў навуковай праблематыцы грамадскіх кафедр універсітэта.

У вырашэнні пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю юрыдычнай навукі і паляпшэнню юрыдычнай асветы ў краіне» асаблівая ўвага ў даследчай дзейнасці універсітэта звярочваецца на развіццё такіх галін прававой навукі, як крыміналогія, судовая псіхалогія і савецкае будаўніцтва, на арганізацыю сацыялагічных даследаванняў па гэтых галінах прававой навукі, на распрацоўку навукова абаснаваных рэкамендацый па пытаннях барацьбы са злачынствам, удасканалення арганізацыі дзейнасці дзяржаўнага апарата. Арганізацыя крыміналагічных даследаванняў па пытаннях папярэджання злачынства, навуковага абагульнення дзейнасці судовых органаў дазволяць унесці ў адпаведныя інстанцыі навукова абаснаваныя рэкамендацыі.

Вялікія планы і ў навуковых супрацоўнікаў гуманітарнага профілю. Тут праводзяцца даследаванні па тэорыі і гісторыі рускай, беларускай і іншых нацыянальных літаратур і моў, іх узаемасувязі і ўзаемаўплывы; збор, апрацоўка і падрыхтоўка да выдання паэтычных скарбніц народнай творчасці, што з'явіцца значным укладам у развіццё беларускай фалькларыстыкі і будзе мець немалаважнае значэнне для развіцця беларускай нацыянальнай культуры ўвогуле. Далейшае развіццё атрымае распрацоўка шэрагу пытанняў па гісторыі савецкага друку ў Беларусі, беларускай публіцыстыкі. Кафедрай педагогікі і псіхалогіі будуць працягнуты даследаванні гісторыі развіцця народнай асветы ў БССР за гады Савецкай улады.

Важнае значэнне маюць навуковыя даследаванні, якія праводзяцца вну па гаспадарчых дагаворах с прадпрыемствамі і арганізацыямі. Ва універсітэце, як правіла, гэтыя работы выконваюцца ў плане агульнай накіраванасці кафедр і лабараторый. Па ўзроўню выканання і сваёй актуальнасці большасць з іх маюць вялікую практычную каштоўнасць для народнай гаспадаркі.

Д. УМРЭЙКА,
начальнік навукова-даследчага сектару,
дацэнт.

## САМЫ ВЯЛІКІ НАБЫТАК

Сталі традыцыйнымі вечары сустрэч студэнтаў універсітэтаў краіны, якія праводзяць гасцінныя гаспадары Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. Вось і сёлета ў час канікул у дзявяты раз да берагоў Нявы з'ехаліся студэнты з Маскоўскага, Харкаўскага, Беларускага, Казанскага, Саратаўскага, Ашхабадскага і Кішынёўскага універсітэтаў.

Галоўнае, што сабрала тут студэнцкую моладзь, — гэта любоў да мастацтва, музыкі, песні. Кожны калектыў прадставіў на суд журы і сваіх сяброў разнастайную цікавую праграму.

Умовы агляду былі жорсткімі .Трэба было ўкласціся ў вызначаны рэгламент, песні таксама павінны былі адпавядаць вызначанай тэматыцы. Але, нягледзячы на ўсё гэта, мастацкія калектывы паказалі даволі высокае майстэрства. Другі год запар жаночы ва-



кальны калектыў «Аэліта» Харкаўскага універсітэта займае першае месца. Песні ў выкананні дзяўчат з братняй Украіны спадабаліся ўсім і надоўга застануцца ў памяці.

Цікавыя падарункі Ленінграду прывезлі і хлопцы квартэта «Спектр» Саратаўскага універсітэта.

Эстрадны аркестр нашага універсітэта не навічок на вечарах сустрэч у горадзе Леніна. Сёлета мы былі ў другі раз. І трэба сказаць, што наша выступленне не засталося без увагі. Добрае ўражанне аб сабе пакінуў наш спявак, студэнт факультэта журналістыкі Юрый Ражаў, які выканаў амерыканскую народную песню «Місісіпі».

Песня «Грэцыя» ў выкананні студэнткі хімфака Надзі Герасіменка заняла першае месца. Надзя ўзнагароджана Ганаровай граматай і каштоўным падарункам. І яшчэ адна прыемнасць. Эстрадны аркестр за выкананне аркестровай п'есы таксама адзначан Ганаровай граматай.

За час знаходжання ў Ленінградзе мы добра адпачылі, пабывалі ў тэатрах, наведалі Эрмітаж, шматлікія музеі і гістарычныя месцы, якія звязаны з нараджэннем Савецкай улады.

Шмат сяброў з'явілася ў нашых студэнтаў за гэты час у розных кутках краіны. І сяброўства, напэўна, самы вялікі набытак гэтай падзеі.

А. САКАЛОЎ,
удзельнік эстраднага аркестра.

На здымках: спявае Надзя Герасіменка; студэнт фізфака Ігар Буякоў — ветэран аркестра. Вось ужо трэці год ён актыўна ўдзельнічае ў жыцці калектыву мастацкай самадзейнасці.

Фота аўтара.





Саша Сцепаненка—першакурснік, але яму даручаюць выконваць складаныя сольныя партыі. Электрагітара — яго любімы інструмент.

